быць учынена", "...а яны б добраахвотна даць удовлетворенія не жадалі ці справядлівасці са сваіх падданых не ажыццяўлялі" і інш.

Што тычыцца прынцыпаў разумнасці і добрасумленнасці, то, безумоўна, яны сустракаюцца не так часта, аднак і яны знайшлі месца ў Статуце.

Разглядаючы сучаснае заканадаўства Рэспублікі Беларусь, адзначым, што яно грунтуецца на юрыдычнай практыцы, якая сфарміравалася на працягу стагоддзяў. Таму ў юрыдычных нормах, напрыклад Грамадзянскім кодэксе, даецца азначэнне асноўных палажэнняў грамадзянскага заканадаўства, да якіх адносяцца і прынцыпы добрасумленнасці і разумнасці.

Такім чынам, ідэі сацыяльна-гуманітарнага зместу даюць магчымасць прасачыць сувязь паміж сацыяльна-эканамічным, палітычным станам грамадства і ўзроўнем яго юрыдычнай культуры, разуменнем маральна-этычнай значнасці права на розных ступенях развіцця грамадства.

**В.С.Варапаева**, *прафесар*

## ЛІТАРАТУРА ЯК СРОДАК РАЗВІЦЦЯ І ВЫХАВАННЯ АСОБЫ

Вядомы псіхолаг А.М. Лявонцьеў даказаў, што асоба нараджаецца двойчы. Першы раз, калі ў дзіцяці з'яўляюцца поліматываванасць і ўпарадкаванасць дзеянняў. Гэта малодшы дашкольны ўзрост. Другі, калі ўзнікае свядомая асоба: чалавек усведамляе і будуе сябе сам (юнацкі і падлеткавы ўзрост). Пры гэтым вельмі важным з'яўляецца той факт, у якім асяроддзі жыве чалавек, як яно ўплывае на яго, якія ў яго выхавальнікі. На думку прыходзіць прыклад з твораў знакамітага вучонага-энцыклапедыста Авіцэны. Два ягняткі былі змешчаны ў клеткі. Кармілі і да-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

глядамі іх аднолькава, але адно з іх расло хілым, прыгнечаным, худым. А другое мела добры апетыт, было вясёлым, жвавым. Чаму? Аказваецца, што клетка першага ягняці была пастаўлена насупраць клеткі ваўка, і ягня бачыла толькі яго. А другое бачыла лес, луг, кветкі. Менавіта прыгажосць, станоўчыя эмоцыі давалі яму сілу і жыццяздольнасць. Адсюль вынікае, што ўмовы выхавання – вялікая справа, і імі вызначаецца лёс чалавека.

У сучаснай псіхалогіі сцвярджаецца канцэпцыя асобы як аўтаномнага суб'екта сацыяльнай дзейнасці. "Можна меркаваць, што тое гістарычнае новаўтварэнне, якое з пункту гледжання філасофскага аналізу выступае як набытая індывідам якасць асобы (аўтаномнага суб'екта дзейнасці), з псіхалагічнага пункту гледжання ёсць не што іншае, як здольнасць авалодання ўласнымі паводзінамі, якія з'яўляюцца параджэннем сацыяльнага па сваім характары ладу жыцця чалавека ..." – сцвярджаў Д.А.Лявонцьеў. Гэтая канцэпцыя развівае ідэі Л.С.Выгоцкага. Ён пісаў: "Паняцце асобы ёсць ... сацыяльны адбітак паняцця, якое будуецца на падставе таго, што дзіця выкарыстоўвае ў адносінах да самога сябе тыя ж прыёмы прыстасавання, якія яно выкарыстоўвае ў адносінах да іншых. Вось чаму можна сказаць, што асоба ёсць сацыяльнае ў нас". Л.С. Выгоцкі даказаў, што асоба ўзнікае ў выніку развіцця, пад уплывам выхавання, у тым ліку і ў працэсе чытання. Працэс станаўлення асобы адрозніваецца яе здольнасцю праяўляць пэўныя адносіны да свету, асяродку, жыццядзейнасці, здольнасцю як бы ўзнімацца над сабою, ацэньваць сябе з боку, з пазіцыі іншага. Дзякуючы гэтаму асоба і падуладна ўздзеянню мастацкага вобраза: ён выступае своеасаблівым люстэркам, у якім чытач – асоба, што развіваецца, мае магчымасць убачыць і ацаніць сябе, выказаць свае адносіны да вобраза і той рэчаіснасці, якая адлюстравана ў ім. З гэтага вынікае адна з цэнтральных метадалагічных установак выхавання асобы ў працэсе чытання: яго накіраванасць на фарміраванне здольнасці меркаваць, мець свой погляд, свае адносіны да чытаемага твора і здольнасці пераносіць гэтыя адносіны на самога сябе. Але чытан-

не прадукцыйнае толькі тады, калі яно арыентавана на засваенне літаратуры на ўзроўні "асобаснага сэнсу", што не сумяшчальна з разуменнем чытання як дзеяння, мэта якога – толькі пашырэнне ведаў, узбагачэнне індывіда рознай інфармацыяй. Сама прырода асобы і працэс яе станаўлення абумоўліваюць адзінства пазнавальнай, выхаваўчай накіраванасці чытання. Пазнанне губляе выхаваўчую сілу, калі не мае асобаснага сэнсу.

Такім чынам, пакуль студэнт не ўсвядоміць, што чытанне пэўнай літаратуры патрэбна менавіта яму (і не толькі дзеля здачы заліку ці экзамену), і само чытанне, і пазнанне губляюць сэнс. Таму, праяўляючы клопат аб сапраўдным уплыве чытання, літаратуры на асобу, неабходна актывізаваць значнасць дадзенай дзейнасці для асобы, абумовіць яе мэтанакіраванасць. Безумоўна, патрэбы чалавека – гэта вынік і выхаванне ў сям'і, уплыў пэўных канкрэтных сітуацый, усёй атмасферы яго жыцця. Ступені ж духоўнасці суб'екта, яго творчая прадукцыйнасць вызначаюцца: 1) патрэбай пазнання, незадаволенасці тымі ведамі, якія ёсць; 2) патрэбай несці свае веды іншым (альтруізм). Л.М. Талстой сцвярджаў, што чалавек духоўны ў той меры, у якой ён "жыве сваімі думкамі і чужымі пачуццямі".

Фарміраванне асобы студэнта пад уздзеяннем мастацтва здзяйсняецца перш за ўсё ў працэсе непасрэднага ўспрымання твораў, шляхам эмацыянальнага самаўключэння ў чужое жыццё, адлюстраванае ў кнізе, праз яго адкрыццё і разуменне. Чым больш эстэтычны і пісьменны чытач, тым больш значны, эфектыўны педагагічны вынік чытання. Эстэтычная прырода твораў мастацкай літаратуры вызначае іх успрыманне як працэс індывідуальна творчы. Па-першае, таму што чытанне – гэта даверлівы дыялог пісьменніка і чытача. Па-другое, творчае чытанне – актыўная духоўная сумесная творчасць чытача і пісьменніка. Першы як бы паўтарае ўжо пройдзены аўтарам твора шлях, пазнаючы жыццё, адноўленае ў творы. Гэта духоўная дзейнасць працягваецца і пасля таго, як перагорнута апошняя старонка кнігі: узнікаюць думкі, пачуцці, меркаванні, вобразы працягва-

юць "дзейнічаць", выклікаць параўнанні, асацыяцыі, уплываюць на раней набытыя ўстаноўкі, погляды. Але гэта адбываецца толькі тады, калі чытанне становіцца патрэбай, калі яно ўнутрана неабходна, асабасна значнае.

Творчае чытанне – аснова фарміравання мастацкага густу. Разам з тым сам працэс творчага чытання як бы бярэ пачатак з маючых у прыродзе чалавека задаткаў густу, пачуцця слова, мастацкай інтуіцыі. Тут мы сустракаемся з праяўленнем дыялектыкі развіцця і станаўлення асобы ў працэсе творчага чытання і пад яго ўплывам: чым духоўна больш багаты чалавек, тым больш магчымасцей для чытання-творчасці. У той жа час чым больш творчым і сістэматычным з'яўляецца чытанне, тым інтэнсіўней працэс фарміравання асобы. Творчае чытанне прадугледжвае пэўную сістэму спецыяльных мастацкіх ведаў пра літаратуру, мастацкую творчасць, зацікаўленасць у ведах пра сябе і пра навакольны свет, жывасць пазнавальных інтарэсаў. Апошняе, у сваю чаргу, знаходзіць задавальненне ў працэсе творчага чытання, якое дае студэнту эстэтычную асалоду.

Разважаючы аб працэсе чытання, І.Гётэ так характарызаваў чытачоў: "Ёсць тры віды чытачоў: першы – гэта тыя, якія цешацца, не разважаючы; другі – тыя, якія разважаюць, не атрымліваючы асалоды, і трэці, сярэдні, – тыя, хто разважае, цешачыся, і цешыцца, разважаючы. Іменна гэтыя, апошнія, і ўзнаўляюць твор нанава".

Творчае чытанне – працэс аднаўлення чытачом тых рэалій, якія складаюць прадмет мастацкай творчасці пісьменніка і яго адносін да прадмета, яго эстэтычнай пазіцыі, яе прызнання або адмаўлення, сцвярджэння або выкрыцця, спачування, шкадавання або іроніі, стрыманага непрымання, усмешкі, здзіўлення ці засмучэння. І заўсёды гэта працэс пазнання аб'ектыўнага свету і ўнутранага чалавечага стану – псіхалогіі асобы ў яе самых разнастайных праявах. Усё гэта пры ўмове, калі студэнты сістэматычна чытаюць і іх чытанне мае асобасны сэнс.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як зрабіць, каб чытанне набыло гэты асобасны сэнс, каб яно стала творчым? Трэба вельмі сур'ёзна паставіцца да адбору тых твораў, якія прапануюцца для самастойнага чытання па пэўных курсах сусветнай літаратуры.

У спісы павінны ўвайсці творы, якія ўтрымліваюць зарад сапраўднай духоўнасці і якія здольныя аказаць уплыў на развіццё асобы чытача, абудзіць і стымуляваць яго маральнасць. Неабходна пазбавіцца ад значнай колькасці твораў, улічваючы, што студэнты вывучаюць не толькі літаратуру, але і іншыя прадметы.

Ці варта ўключаць у спісы творы, з якімі вучні пазнаёміліся ў школе? Пытанне гэта ўзнікае таму, што ў студэнтаў часам складваецца ўражанне, быццам у ВНУ паўтараецца школьная праграма. Можа, у пачатку чытання курса варта праводзіць індывідуальную гутарку: якія творы са школьнай праграмы прачытаны? Якое ўражанне пакінулі? Якія думкі, меркаванні яны выклікалі? і інш.

Трэба пазбавіцца і ад устарэлых маральна твораў, якія не здольны выклікаць у студэнтаў эмацыянальную рэакцыю, больш увагі надаваць выхаванню творчага чытача, накіроўваць ўвагу студэнтаў на тое, што чытацкія дзённікі, якія мы штотыдзень праглядаем, павінны мець не толькі кароткі пераказ твора, але і асабістыя думкі, меркаванні.

Не трэба шкадаваць часу і на лекцыйных занятках 5–10 мінут удзяляць аналізу самастойна прачытаных кніг. Неабходна часцей праводзіць творчыя работы: абмеркаванне твораў, якія таго патрабуюць, літаратурныя вечарыны, дыспуты, канферэнцыі і інш.

Такім чынам, у праграме эстэтычнага самаразвіцця студэнтаў неабходна прадугледзець тры асноўныя кірункі: пастаяннае пашырэнне асабістага вопыту непасрэднага ўспрымання твораў мастацтва розных відаў і жанраў; аналітычнае чытанне мастацказнаўчай, літаратуразнаўчай і іншай літаратуры; асабістую творчасць (напрыклад, удзел у літаратурных гуртках) у залежнасці ад асабістых схільнасцей, бо творцу глыбей можа зразумець творца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ